ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
“СІМАНІЦКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА”

# Праект "Прафесіі ў сельскай гаспадарцы"

Маслава Вераніка Мікалаеўна

Сіманічы, 2026

**Мэта праекта**: стварэнне ўмоў для прафесійнага самавызначэння навучэнцаў профільнага класа аграрнай накіраванасці.

**Задачы пазнавальна-выхаваўчыя:** 1. Расказаць пра прафесіі ў галіне сельскай гаспадаркі 2. Фарміраваць у навучэнцаў разуменне значнасці сельскай гаспадаркі як асновы харчовай бяспекі. 3. Выхоўваць павагу да людзей, якія працуюць у сельскай гаспадарцы

**Задачы развіццёвыя:** 1. Развіваць уменні вучняў даследаваць, фарміраваць уласнае меркаванне. 2. Развіваць уменне працаваць у калектыве, уважліва і з павагай адносіцца да працы кожнага члена калектыву. 3. Выпрацоўваць адчуванне адказнасці за асабіста выкананую працу.

**Тып праекта**: сярэднетэрміновы (два тыдні), пазнавальны.

## ЭТАПЫ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАЕКТА

***1. Каштоўнасна-арыентацыйны.***

**Праектная ініцыятыва**.

Выбар, фармуляванне і абмеркаванне тэмы праекта ( “Прафесіі ў сельскай гаспадарцы” – мерапрыемства пра прафесіі ў галіне сельскай гаспадаркі); вусныя выказванні вучняў з прапановай пытанняў, якія павінны стаць галоўнымі ў рабоце над праектам, аналіз і канкрэтызацыя прапанаваных пытанняў (знайсці інфармацыю пра прафесіі трактарыста і пчаляра, звесткі з гісторыі гэтых прафесій, інфармацыю, дзе можна набыць гэтыя прафесіі ў Беларусі, інфармацыю пра месцы працы і асаблівасці працы па выбраных прафесіях); выбар крыніц інфармацыі (бібліятэкі, інтэрнет, інфармацыя ад родзічаў, настаўнікаў, аднавяскоўцаў).

**Вызначэнне канчатковага рэзультату праекта.**

Усведамленне важнасці сельскай гаспадаркі ў сусветнай эканоміцы па забеспячэнні насельніцтва прадуктамі харчавання, што гарантуе дзяржаве харчовую, а адпаведна, і стратэгічную бяспеку, і, як следства, важнасці і запатрабаванасці прафесій у аграрнай галіне.

***2. Канструктыўны.***

**Размеркаванне абавязкаў.**

Кіраўнік праекта (настаўнік, які выкладае факультатыўныя заняткі “Уводзіны ў аграрныя прафесіі”); гісторыкі (з гісторыі прафесій – 2 вучні), сучаснікі (асаблівасці працы па выбраных прафесіях у цяперашні час – 2 вучні), даследчыкі (у якіх навучальных установах можна набыць прафесіі – 2 вучні), творцы (творчасць у прафесіі – 2 вучні).

**Распрацоўка групавога навучальнага маршруту.**

*Навошта?* – каб пазнаёміцца з асаблівасцямі дзяржаўнай палітыкі ў галіне развіцця аграпрамысловага комплексу, усвядоміць важнасць беражлівых і паважлівых адносін за зямлі і людзей, якія працуюць у галіне; *пра што даведаемся?* – пра прафесіі ў галіне сельскай гаспадаркі і іх ролю ў забеспячэнні харчовай бяспекі краіны; *каму раскажам?* – усім, хто праявіць цікавасць.

**Стварэнне банка ідэй.**

З мэтай пошуку патрэбнай інфармацыі:

- Наведаць школьную і сельскую бібліятэкі, знайсці кнігі і інфармацыйныя матэрыялы пра прафесіі трактарыста і пчаляра.
- Звязацца з ветэранам педагагічнай працы, былым выкладчыкам трактарнай справы ў нашай школе, Верасовічам Мікалаем Пятровічам, каб атрымаць звесткі пра прафесію трактарыста ў нашым рэгіёне.
- Пагутарыць з мясцовымі пчалярамі і бортнікамі пра іх занятак.
- Шукаць патрэбныя звесткі ў сетцы інтэрнет.
- Правесці пошукавую работу па знаходжанні навучальных устаноў, якія рыхтуюць трактарыстаў і пчаляроў.
- Наведаць віртуальныя бібліятэкі ў сетцы інтэрнет, каб знайсці адлюстраванне прафесій трактарыста і пчаляра ў публіцыстыцы і літаратуры.

**Выбар формы абароны праекта** (творчая справаздача з выкарыстаннем падрыхтаванай нагляднасці).

**Збор і апрацоўка матэрыялу.**

- Апрацаваць знойдзеную інфармацыю.
- Вызначыць форму падачы інфармацыі (паведамленні з прэзентацыяй).
- Стварыць творчую работу пра мясцовага трактарыста-передавіка.

***3. Ацэначна-рэфлексіўны.***

**Падрыхтоўка абароны праекта.**

| Удзельнікі | Абавязкі (задачы) |
|---|---|
| Кіраўнік праекта | Абгрунтаваць актуальнасць абранай тэмы.<br>Скласці план правядзення мерапрыемства. |
| Гісторыкі | Падрыхтаваць паведамленні з гістарычнымі звесткамі пра прафесіі. |
| Сучаснікі | Падрыхтаваць паведамленні пра асаблівасці працы па выбраных прафесіях у цяперашні час. |
| Даследчыкі | Падрыхтаваць паведамленні пра тое, у якіх навучальных установах можна набыць прафесіі трактарыста і пчаляра. |
| Творцы | Падрыхтаваць творчую работу і звесткі пра адлюстраванне прафесій у публіцыстыцы і літаратуры. |

***4. Прэзентацыйны.***

**Творчая справаздача “Прафесіі ў сельскай гаспадарцы ”**

***Мерапрыемства праводзіцца 1 гадзіну***

***Праводзяць мерапрыемства вучні і настаўнік, які выкладае факультатыўныя заняткі “Уводзіны ў аграрныя прафесіі”***

***Запрошаныя на мерапрыемства: вучні 8-9 класа, бацькі, настаўнікі***

**Абсталяванне:** мультыборд з выхадам у інтэрнет**.**

**Афармленне:** нагляднасць на тэму мерапрыемства, прэзентацыя, якая ілюструе змест мерапрыемства.

***Ход мерапрыемства***

***1.Уступ***

**Кіраўнік праекта:**

У апошнія гады прафесіі сельскагаспадарчага сегмента пачалі страчваць сваю папулярнасць. Але эксперты сцвярджаюць, што дзякуючы росту навейшых тэхналогій у гэтай сферы прафесіі аграпрамысловага комплексу ў далейшым будуць развівацца і карыстацца нечуваным попытам. Інавацыйныя тэхналогіі дапамогуць лепш і хутчэй працаваць на сельскагаспадарчых прадпрыемствах. Апошнім часам актыўна ўкараняецца аўтаматызацыя ўсіх відаў работ і абсталяванне беспілотнага тыпу, гэта значыць, рабочым будуць дапамагаць робаты. Такім чынам, у будучым будуць запатрабаваны многія прафесіі аграрнага накірунку.

Спецыялісты, якія вывучаюць прафесійную запатрабаванасць на будучыя дзесяцігоддзі, сцвярджаюць, што зусім хутка прафесія аграрыя па сваёй прэстыжнасці абыдзе нават юрыстаў.

У большасці выпадкаў гэтую прафесію выбіраюць маладыя людзі, якія выраслі ў вёсцы і ведаюць тонкасці працы. Але прафесія аграрыя даўно выйшла за межы вёскі і распаўсюджана па ўсёй краіне.

*Прагляд дакументальнага фільма (Слайд 2)*

**https://www.youtube.com/watch?v=N9vkSA2y2_Q**

***2. Асноўная частка***

**Кіраўнік праекта:**

Праект, які мы вам прадстаўляем, прысвечаны прафесіям, якія запатрабаваны ў галіне сельскай гаспадаркі і адыгрываюць вялікую ролю ў забеспячэнні харчовай бяспекі краіны. Пры выбары прафесій, пра якія захацелі даведацца і расказаць прысутным на мерапрыемстве вучні агракласа, мы спыніліся на прафесіях трактарыста і пчаляра. Выбар прафесій не выпадковы, бо многія ў вёсцы займаюцца

бортніцтвам, і бацькі вучняў працавалі або працуюць трактарыстамі ў сельскай ці лясной гаспадарцы.

Слова ўдзельнікам праекта – гісторыкам, якія падрыхтавалі паведамленні з гісторыі прафесій.

**Першы гісторык:**

**З гісторыі прафесіі трактарыста**

Прафесія “трактарыст” узяла свой пачатак у XIX стагоддзі, менавіта тады, калі кваліфікаваныя майстры прыдумалі і распрацавалі самы першы трактар. Першапачаткова ўсе спецыялісты, якія працавалі з такой тэхнікай, называліся машыністамі. Прычынай стварэння трактара была неабходнасць эфектыўнага палягчэння цяжкай працы сялянам. Такім чынам, першы трактар з'яўляўся асноўнай сельскагаспадарчай прыладай працы. З часам ствараліся трактары, на якія ўстанаўліваліся дадатковыя шматфункцыянальныя інструменты і новая тэхніка, з дапамогай якіх трактары пачалі прымяняцца ў будаўнічай і горнай прамысловасці. *(Слайд 3)*.

Першы трактар быў прыдуманы на паравым рухавіку і выраблены ў Вялікабрытаніі ў сярэдзіне XIX стагоддзя. Тады ж з'явіліся і першыя трактарысты. Больш дасканалую мадэль з рухавіком унутранага згарання пабудавалі ўжо амерыканцы ў канцы таго ж XIX стагоддзя і выкарыстоўвалі яго толькі ў сельскай гаспадарцы. Менш масіўныя машыны сталі вырабляць ужо на пачатку XX стагоддзя. *(Слайд 4).* Так і атрымала распаўсюджванне прафесія трактарыста-машыніста. Гэтыя людзі працавалі ўжо не толькі ў полі, але і на будоўлі, і на іншых вытворчых аб’ектах. Першыя трактары былі звычайнымі цягачамі, не мелі спецыяльных прылад  у выглядзе каўша, адбойнага молата і тых механізмаў, якія ўстанаўліваюцца на сучасных мадэлях. У нашай краіне такая тэхніка атрымала сваё распаўсюджванне ўжо ў савецкі час. *(Слайд 5).*

У 30-40-х, пачатку 50-х гг. XX стагоддзя на базе прафесіі трактарыста з'явіліся прафесіі камбайнера прычапнога камбайна, сеяльшчыка, машыніста

буракаўборачнага, бульбаўборачнага і сіласаўборачнага камбайнаў. Са з'яўленнем трактароў на гусенічным ходу нараўне з прафесіяй трактарыста колавых трактароў з'явілася прафесія трактарыста гусенічных трактароў. Адначасова ў прамысловасці для працы на трактарах-цягачах узнікла спецыяльнасць трактарыста-вадзіцеля. *(Слайд 6)*. У 50-х гг., у сувязі са з'яўленнем трактароў, абсталяваных навяснай сістэмай, прафесійныя функцыі прычэпшчыка перайшлі да трактарыста. У выніку сфармавалася якасна новая прафесія – трактарыст-машыніст, якая цяпер у сельскай гаспадарцы называецца "Механізатар" і з'яўляецца пераважнай.

Прадстаўнікі прафесіі трактарыста робяць вялікі ўклад у народную гаспадарку. Без іх не змогуць працаваць камунальныя службы, фермы, прампрадпрыемствы і многія іншыя арганізацыі. Паколькі людзі з такой спецыяльнасцю прысутнічаюць на многіх прадпрыемствах з розным напрамкам дзейнасці, то прафесію трактарыст можна смела назваць запатрабаванай.

**Другі гісторык** *(інфармацыя прадстаўлена на слайдах):*

**З гісторыі прафесіі пчаляра** *(Слайд 7)*

**З гісторыі бортніцтва-пчалярства** *(Слайд 8)*

**Захаванне традыцый** *(Слайд 9,10)*

**Кіраўнік праекта:**

Як бачым, прафесіі трактарыста і пчаляра маюць сваю гісторыю, і былі запатрабаваны ў насельніцтва з моманту іх узнікнення. А як гэтыя прафесіі бачацца ў цяперашні час? Ці ёсць у іх будучыня? Слова даследчыкам асаблівасцей працы па выбраных прафесіях у сучаснасці.

**Першы сучаснік:**

**Ці ёсць будучыня ў прафесіі трактарыста-механізатара?**

Механізатар у наш час вельмі патрэбная і запатрабаваная прафесія. *(Слайд 11)*. Сучасны трактарыст-машыніст павінен шмат ведаць. У першую чаргу варта цікавіцца развіццём тэхнічных магчымасцей машын, рухавікоў, тэхналагічнай вытворчасці і агратэхнічнымі патрабаваннямі. З поўнай упэўненасцю можна

сказаць, што людзі такой прафесіі ўносяць вялікі ўклад у развіццё эканомікі краіны ў цэлым.

Сучасная сельская гаспадарка, будаўніцтва, камунальная гаспадарка і іншыя галіны пастаянна маюць патрэбу ў кваліфікаваных трактарыстах. Набыццё ведаў і навыкаў у галіне кіравання і абслугоўвання трактароў, а таксама дадатковае навучанне ў вышэйшых навучальных установах адкрывае шырокія кар'ерныя перспектывы.

Што чакае прафесію трактарыста-машыніста ў будучым? Безумоўна, аўтаматызацыя. Гэта значыць, з'яўленне трактароў і іншага абсталявання з аўтаматычным кантролем, якое можа знізіць патрэбу ў непасрэдным кантролі над машынай. Магчыма, трактарыст будзе выступаць аператарам або назіральнікам, кантралюючы працу аўтаматызаваных сістэм.

У сучаснай сельскай гаспадарцы ўжо прымяняюцца тэхналогіі дакладнага земляробства – рух, агрэгаты і іншае. Новыя тэхналогіі дазваляюць выверыць маршрут з дакладнасцю ў некалькі сантыметраў, а кіруе ўсім гэтым трактарыст-машыніст. Яму трэба не толькі ездзіць на трактары, але ўмець наладзіць прыборы, разбірацца ў працэсах, якія адбываюцца. Цяпер ужо тэхніка такая, што патрабуе ведаў іншага ўзроўню. Так што трактар два дзясяткі гадоў назад і цяпер – гэта зусім розныя машыны. Сучасны яшчэ і камфортны, з кандыцыянерам, падагрэвам сядзенняў і гэтак далей. *(Слайд 12).*

У чым плюсы прафесіі? Галоўны - гэта запатрабаванасць. Трактарысты патрэбны ў розных галінах краіны: сельскай і лясной гаспадарцы, будаўніцтве дарог і газаправодаў, здабычы карысных выкапняў. Трактарыстаў не хапае, моладзь мала ідзе працаваць па спецыяльнасці. Яшчэ адна добрая якасць – прафесія высокааплатная, залежыць ад такіх умоў, як стаж, выкананне задач.

А недахопы? Цяжкія ўмовы працы. Працаваць даводзіцца па зменах і ў любое надвор'е. Бываюць і перапрацоўкі, каб выканаць усе неабходныя задачы. Мінус у прафесійных захворваннях, напрыклад, са зрокам, слыхам.

Трактарыст – прафесія, якая заўсёды будзе патрэбнай. Многія думаюць, што гэтая прафесія не можа забяспечыць дастойную будучыню, але гэта зусім не так. Трактарысты былі заўсёды патрэбнымі ў розных галінах работнікамі і наш час не выключэнне. Атрымаўшы адукацыю трактарыста, вы можаце быць упэўнены ў тым, што ў вас будзе праца. Навучанне трактарнай справе – гэта добры ўклад у сваю стабільную будучыню. Сельскагаспадарчая галіна развіваецца хуткімі крокамі, а значыць, такая прафесія, як трактарыст, не знікне, а будзе запатрабаванай эканомікай.

**Другі сучаснік** *(інфармацыя прадстаўлена на слайдах):*

**Прафесія пчаляра ў сучаснасці** *(Слайд13)*

**Месца працы пчаляра** *(Слайд 14, 15)*

**Атрыбуты пчалярскай прафесіі** *(Слайды 16,17,18, 19,20)*

**Прафесійныя кампетэнцыі** *(Слайд 21)*

**Кіраўнік праекта:**

Я таксама ўпэўнена ў тым, што выбраныя прафесіі і ў сучаснасці, і ў будучым будуць запатрабаваны, бо яны важныя і патрэбныя для жыцця людзей. Запрашаю даследчыкаў паведаміць пра тое, у якіх навучальных установах можна набыць прафесіі трактарыста і пчаляра.

**Першы даследчык:**

**Дзе можна атрымаць прафесію механізатара?**

Атрымаць прафесію механізатара, ці трактарыста-машыніста, можна ў многіх навучальных установах аграрнай накіраванасці нашай краіны. Сайт для абітурыентаў "KudaPostupat.by" выдае вялікае мноства варыянтаў. Гэта значыць, што прафесія запатрабаваная. *(Слайд 22).*

У цэлым, у Гомелі і іншых гарадах Беларусі існуе некалькі спосабаў атрымаць прафесію трактарыста:

1. Навучанне ў вышэйшых навучальных установа. Праграмы "Аўтамабілі, трактары, мабільныя і тэхналагічныя комплексы" могуць быць прыдатным варыянтам для атрымання вышэйшай адукацыі ў гэтай галіне.

2. Навучанне ў каледжах і ліцэях. Каледжы і ліцэі з аграрным профілем могуць прапанаваць праграмы навучання трактарыстаў, якія ахопліваюць практычныя навыкі і тэарэтычныя веды.

**Другі даследчык** *(інфармацыя прадстаўлена на слайдзе):*

**Дзе можна атрымаць прафесію пчаляра?** *(Слайд 23)*

**Кіраўнік праекта:**

Мала хто ў сваім жыцці абыходзіцца без духмянага хлеба і кубка халоднага малака. Людзям многіх прафесій мы ўдзячны за ежу, што прыходзіць на наш стол. Галоўная прафесія, без якой было б вельмі складана і цяжка здабываць прадукты харчавання, – гэта механізатар са сваім жалезным канём, што даўно ўжо аблегчыў людзям працу па апрацоўцы зямлі і вырошчванні сельскагаспадарчай прадукцыі.

У нашым агракласе ёсць вучань, бацька якога не проста механізатар, а перадавік сельскай гаспадаркі, адзначаны многімі граматамі і падзякамі. Федаровіч Косця падрыхтаваў творчую работу пра свайго бацьку Федаровіча Мікалая Канстанцінавіча.

**Першы творца:**

**Эсэ "Мой бацька – механізатар"** *(Дадатак 1)*

**Прэзентацыя да эсэ** *(Дадатак 3)*

**Кіраўнік праекта** *(інфармацыя прадстаўлена на слайдзе):*

**Старажытная прафесія** *(Слайд 24)*

Як бачым, пчаляр-бортнік – прафесія творчая. Нашы вучні сабралі звесткі пра адлюстраванне гэтай прафесіі ў публіцыстыцы і літаратуры.

**Другі творца:**

У беларускіх пчаляроў ёсць свой прафесійны часопіс "Беларускі пчаляр". *(Слайд 25).* Гэта адзіны ў рэспубліцы прафесійны часопіс для пчаляроў, які

запрашае чытачоў на сваіх старонках абмеркаваць праблемы сучаснага пчалярства ў Беларусі, даведацца пра навіны ў пчаляроў блізкага і далёкага замежжа, пазнаёміцца з прапановамі вытворцаў пчалярскага інвентару і абсталявання, абмяняцца аб'явамі аб куплі-продажы ўсяго, што звязана з пчалярствам. Маладыя пчаляры на старонках часопіса змогуць атрымаць парады дасведчаных пчаляроў.

Перыядычнасць выхаду: 1 раз у 2 месяцы. Пазнаёміцца і набыць можна на сайце : https://belkiosk.by/belpchal

У пчаляроў ёсць таксама прафесійнае свята. Яно напрамую звязана з нашым аграгарадком Сіманічы. *(Слайд 26).*

Таксама ў беларускіх пчаляроў ёсць свой гімн, напісаны старшынёй Праўлення рэспубліканскай арганізацыі “Беларускія пчаляры” Міцько Сяргеем Іванавічам на беларускай мове. Я прачытаю шчырыя і прачулыя словы гэтага гімна. *(Слайд 27).*

Навіны Рэспубліканскай арганізацыі “Беларускія пчаляры” можна паглядзець на сайце:
**https://www.medosbor.by/index.php?option=com_content&view=featured&Itemid=101**

### *3. Заключэнне*

**Кіраўнік праекта:**

Трактарыст-механізатар і пчаляр-бортнік – прафесіі, якія заўсёды будуць патрэбнымі. Многія думаюць, што гэтыя прафесіі не змогуць забяспечыць дастойную будучыню, але гэта зусім не так. Сельскагаспадарчая галіна развіваецца хуткімі крокамі, і калі ў вас ёсць прызванне да гэтых прафесій, то яны забяспечаць вас працай і заробкам на ўсё далейшае жыццё. Слухайце сваё сэрца і выбірайце прафесію па душы.

Заканчваем наша мерапрыемства гімнам беларускіх пчаляроў, які ў поўнай меры адлюстроўвае светапогляд беларусаў і асабліва нас, палешукоў. Нездарма прафесійнае свята пчаляроў праводзіцца іменна ў нашых Сіманічах, дзе ў многіх

дамах ёсць пчалярскія атрыбуты, а ў лесе – свае борці, як спадчынны набытак ад продкаў. https://www.youtube.com/watch?v=aGepTgLCUm4&t=102s

## Выкарыстаныя крыніцы


1. Кавалёў, А. Е. Многа мёду/ А. Е.Кавалёў. – Масква: АСТ, 2024. – 128.
2. Кузьміных, А. П. Пчалярству вучыся ў пчол / А. П. Кузьміных. – Екацерынбург: БКІ, 2013. – 152 с.
3. Ціхаміраў, В, В. Пчалярства. Усё самае важнае для тых, хто хоча стаць пчаляром /В. В. Ціхаміраў. – Масква: Эксмо, 2020. – 336 с.
4. Ленскі, А. В. Даведнік трактарыста-машыніста / А. В. Ленскі. – Мінск: Народная асвета, 1997. – 347 с.
5. Сайдулаева, Л. А. Выкананне работ па прафесіі рабочага: трактарыст-машыніст сельскагаспадарчай вытворчасці / Л. А. Сайдулаева. – Мінск: Народная асвета, 2009. – 268 с.


Дадатак 1

**Федаровіч Канстанцін**

**Эсэ “Мой бацька – механізатар”**

Праца механізатара знаёмая мне не па чутках. *(Слайд 2).* Мой бацька Федаровіч Мікалай Канстанцінавіч – адзін з лепшых механізатараў нашага Лельчыцкага раёна. Яго праца адзначана многімі ўзнагародамі на ўзроўні раёна і вобласці. *(Слайд 3).*

У нашай школе да 2023 года вучні старэйшых класаў вывучалі трактарную справу і атрымоўвалі пасведчанне трактарыста. Нават у эмблеме школы ёсць выява трактара як сведчанне доўгай прафесійнай падрыхтоўкі трактарыстаў. Мой бацька таксама некалі атрымаў пасведчанне трактарыста разам з атэстатам сталасці. Прытым што атэстат у бацькі быў не просты, а разам з сярэбраным медалём. Але жаданне працаваць на зямлі, любоў да тэхнікі, прывітыя бацькамі і школьным настаўнікам трактарнай справы, прадвызначылі прафесію на ўсё далейшае жыццё. Магчыма, прафесія механізатара ў апошні час стала не такой прэстыжнай, бо праца нялёгкая і патрабуе вялікай аддачы, але мой бацька ніколі не шкадаваў, што выбраў іменна гэтую прафесію, і не змяніў яе, хоць было многа магчымасцей.

Ужо боольш за 20 гадоў бацька працуе механізатарам у ААТ "Лельчыцкі аграсэрвіс". У гарачую пару пасяўной і ўборачнай з раніцы і да позняга вечара ён у полі і ведае, як ніхто іншы, якім коштам даюцца высокія намалоты і што такое бітва за ўраджай. Ён не проста добры работнік, а перадавік вытворчасці, які адносіцца да сваёй справы з усёй душой. І толькі чалавек, які любіць сваю зямлю, у якога ў крыві працавітасць і гаспадарлівасць, можа працаваць з такой самааддачай, з такой стараннасцю. За дасягнутыя працоўныя поспехі Мікалай Канстанцінавіч Федаравіч неаднаразова заахвочваўся граматамі райвыканкама, абласнога і раённага камітэтаў прафсаюза працаўнікоў АПК. *(Слайд 4).* Лепшы механізатар на сяўбе ранніх яравых збожжавых і зернебабовых культур, лепшы па прафесіі сярод работнікаў сельскай гаспадаркі – гэта пра майго бацьку. *(Слайд 5)*. У скарбонцы яго працоўных заслуг — падзячныя лісты за высокія працоўныя дасягненні, падзякі за шматгадовую добрасумленную працу і вялікі асабісты ўклад у развіццё

сельскагаспадарчай галіны, прызавыя месцы ў раённым спаборніцтве сярод уборачных экіпажаў. *(Слайд 6).*

Я вельмі ганаруся сваім бацькам, яго прафесіяй. «Гэта менавіта тое, чаго хацелася, тое да чаго ляжыць душа. Я нават не магу растлумачыць словамі, чаму мне падабаецца сядзець у кабіне трактара і выконваць розныя віды работ. Для мяне не галоўнае, што менавіта трэба рабіць: у сельскай гаспадарцы няма непатрэбных ці лішніх справаў. Важна выканаць усё якасна і своечасова», – гаворыць бацька пра сваю прафесію.

Моладзь зараз неахвотна ідзе ў галіну сельскай гаспадаркі. Многія імкнуцца вучыцца ў вялікіх гарадах, якія вабяць сваімі перспектывамі. Зразумела, што адчуўшы смак гарадскога жыцця, мала хто потым вяртаецца ў родную вёску. Напэўна, пакаленне майго бацькі – адно з апошніх, хто з палаючымі вачыма ішоў у сельскую гаспадарку. У нашай школе мы другі ужо клас, вучні якога захацелі вучыцца ў класе аграрнай накіраванасці. Выпускнікі нашай школы вучацца ў Горкаўскай сельскагаспадарчай акадэміі, Віцебскай верэрынарнай акадэміі, Беларускім дзяржаўным аграрна-тэхнічным універсітэце. Мае аднакласнікі таксама збіраюцца паступаць у гэтыя ці падобныя навучальныя ўстановы. Асабіста я – на аўтатрактарны факультэт, каб стаць інжынерам-канструктарам трактарнай тэхнікі, сучаснай і высокатэхналагічнай, але з той жа функцыяй: дапамагаць людзям вырошчваць і вырабляць прадукты харчавання.

# Эсэ “Мой бацька – механізатар”

**Падрыхтаваў вучань 10 класа**

**Федаровіч Канстанцін**

# Мой бацька Федаровіч Мікалай Канстанцінавіч – адзін з лепшых механізатараў нашага Лельчыцкага раёна




## Следы на сердце и родной земле



Многие люди десятилетия своей трудовой деятельности посвятили этому нелёгкому, но такому всем нам необходимому делу — обеспечению продовольственной безопасности. И что бы кто ни говорил, но земледелие всегда было и останется самым необходимым видом деятельности. С годами не прерывается связь поколений, всегда есть те, кто хочет стать хлеборобом.

Один из них — тракторист-машинист открытого акционерного общества «Лельчицкий агросервис» Николай Федорович. Этот обаятельный мужчина в агросервисе трудится двадцать лет, десятый сезон на кормоуборочном комбайне «Ягуар» убирает кукурузу. Руководство его ценит за надёжность, ответственность, отзывчивость.

— Я люблю свою работу, спорт и рыбалку, — поделился в разговоре Николай. — Часто выступаю за Симоничскую футбольную и волейбольную команды, принимаю участие в соревнованиях в составе сборных команд ветеранов.

Кроме любви к работе и занятиям спортом, он ещё и заботливый отец многодетной семьи.

— Старшая Ангелина — будущий экономист, учится в одном из минских вузов, Ксения — ученица 8 класса, Константин — пятиклассник, — рассказал Николай о детях.

Николай Федорович неоднократно получал награды за трудовые достижения: на уборке зерновых и кукурузы, весеннем и осеннем севе, является обладателем звания «Лучший по профессии».

Пусть ещё долгие годы Лельчицкая земля славится своими трактористами, комбайнёрами, агрономами, животноводами. Ведь известно, что работа на земле приносит душевное равновесие, как-то по-особому цепляет, оставляя в сердце неизгладимый след.





КОМИТЕТ
ПО СЕЛЬСКОМУ ХОЗЯЙСТВУ
И ПРОДОВОЛЬСТВИЮ
ГОМЕЛЬСКОГО ОБЛАСТНОГО
ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА

НАГРАЖДАЕТСЯ

ФЕДОРОВИЧ
НИКОЛАЙ КОНСТАНТИНОВИЧ

тракторист-машинист
сельскохозяйственного производства
открытого акционерного общества
«Лельчицкий агросервис»

за многолетнюю плодотворную работу
в системе агропромышленного производства,
а также в связи с празднованием Дня работников
сельского хозяйства и перерабатывающей
промышленности агропромышленного комплекса

Председатель В.Н.Нагорный



ДЫПЛОМ

НАГРАЖДАЕТСЯ

ФЕДОРОВИЧ
НИКОЛАЙ КОНСТАНТИНОВИЧ

лучший механизатор на севе ранних яровых
зерновых и зернобобовых культур
2011 года подсобного хозяйства
ОАО «Лельчицкий агросервис»

Председатель Лельчицкого
районного комитета
профсоюза работников АПК В.И.Кудин



ПОЧЕТНАЯ
ГРАМОТА

РЕСПУБЛИКАНСКИЙ КОМИТЕТ
БЕЛОРУССКОГО ПРОФСОЮЗА РАБОТНИКОВ
АГРОПРОМЫШЛЕННОГО КОМПЛЕКСА

награждает

ФЕДОРОВИЧА
Николая Константиновича

тракториста-машиниста
ОАО «Лельчицкий райагросервис»

за многолетний добросовестный труд
в системе агропромышленного комплекса,
высокое профессиональное мастерство и
достижение высоких производственных
показателей

Председатель В.М.Хватик
30.09.2020 № 452
г. Минск



КОМИТЕТ
ПО СЕЛЬСКОМУ ХОЗЯЙСТВУ И ПРОДОВОЛЬСТВИЮ
ГОМЕЛЬСКОГО ОБЛАСТНОГО
ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА

НАГРАЖДАЕТСЯ

ФЕДОРОВИЧ
НИКОЛАЙ КОНСТАНТИНОВИЧ

тракторист-машинист
ОАО «Лельчицкий агросервис»

За многолетний добросовестный труд
в системе агропромышленного комплекса
и в связи с Днем работников сельского хозяйства
и перерабатывающей промышленности
агропромышленного комплекса

Председатель комитета по сельскому
хозяйству и продовольствию
Гомельского облисполкома — Д.Е.Петрожиц



БЛАГОДАРСТВЕННОЕ
ПИСЬМО

Уважаемый Федорович Николай Константинович

Примите искреннюю благодарность за Трудовую Победу в ходе уборки Урожая 2010 года.

Отмечая Ваши высокие трудовые достижения, которые являются образцом профессионального мастерства, целеустремленности, дисциплинированности и самоотдачи, неравнодушного отношения к делу, мы выражаем Вам свою признательность и благодарим за добросовестный труд.

Ваша ответственность, организованность и неукоснительное исполнение поставленных задач — слагаемые результативной уборочной кампании 2010 года.

Благодарим Вас за нелегкий крестьянский труд. Своей работой Вы внесли достойный вклад в весомый хлебный каравай района и области.

Желаем Вам дальнейших трудовых побед! Пусть Ваш благородный труд приносит радость и достаток! Пусть в Ваших домах царят мир и спокойствие, благополучие, здоровье и счастье!

С уважением,
Председатель
Гомельского областного комитета
профсоюза работников АПК — В. И. Яцевич

2010 год



Благодарность

ЛЕЛЬЧИЦКОГО РАЙОННОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА

ФЕДОРОВИЧУ
НИКОЛАЮ КОНСТАНТИНОВИЧУ,

механизатору подсобного хозяйства
открытого акционерного общества «Лельчицкий агросервис»,

за многолетний добросовестный труд
и большой личный вклад в развитие
сельскохозяйственной отрасли

Председатель районного
исполнительного комитета — М.В.Комок

«01» ноября 2015 г.



# СВИДЕТЕЛЬСТВО

ЛЕЛЬЧИЦКОГО РАЙОННОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА

О ПРИСВОЕНИИ ЗВАНИЯ

«Лучший по профессии – 2022»

В НОМИНАЦИИ
«Лучший в отрасли механизации»

Федоровичу Николаю Константиновичу,

трактористу-машинисту
открытого акционерного общества
«Лельчицкий агросервис»

Председатель районного
исполнительного комитета С.



# Свидетельство

о присвоении звания

«Лучший по профессии»

среди работников сельского хозяйства

Федоровичу
Николаю Константиновичу

механизатору ОАО «Лельчицкий агросервис»

Председатель районного
исполнительного комитета Л.В.Копытков

г.п.Лельчицы
2013 г.



ЛЕЛЬЧИЦКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

# ПОЧЕТНАЯ ГРАМОТА

НАГРАЖДАЕТСЯ

ФЕДОРОВИЧ
НИКОЛАЙ КОНСТАНТИНОВИЧ,

тракторист-машинист
открытого акционерного общества
«Лельчицкий агросервис»,

за добросовестный труд, высокий профессионализм, личный вклад в развитие агропромышленного комплекса Лельчицкого района и за достижение высоких показателей на заготовке кормов

Председатель районного
исполнительного комитета А.Г.Гапоник
«16» ноября 2018 г.